# *ВЯНОЧАК ДА БОЖАЙ МІЛАСЭРНАСЦІ*

Вяночак да Божай Міласэрнасці Пан Езус прадыктаваў святой Фаўстыне ў Вільні 13–14 верасня 1935 года як малітву для суцішвання Божага гневу і перапрашэння за грахі нашыя і ўсяго свету.

*«Праз гэты Вяночак ты выпрасіш усё, калі тое, аб чым просіш, будзе згодна з Маёю воляю» («Дзённік», 1731).*

*«Калі пры паміраючым чытаюць гэты Вяночак, суцішыцца Божы гнеў, і бязмежная міласэрнасць агорне душу» («Дзённік», 811).*

Молімся на звычайным ружанцы.

Напачатку:

**ОЙЧА НАШ**, каторы ёсць у небе, свяціся імя Тваё, прыйдзі Валадарства Тваё, будзь воля Твая як у небе, так і на зямлі.

Хлеба нашага штодзённага дай нам сёння, і адпусці нам правіны нашы, як і мы адпускаем вінаватым нашым, і не ўводзь нас у спакусу, але збаў нас ад злога. Амэн.

**ВІТАЙ, МАРЫЯ**, поўная ласкі, Пан з Табою, благаслаўлёная Ты між жанчынамі і благаслаўлёны плод улоння Твайго, Езус.

Святая Марыя, Маці Божая, маліся за нас, грэшных, цяпер і ў хвіліну смерці нашай. Амэн.

**ВЕРУ Ў БОГА**, Айца ўсемагутнага, Стварыцеля неба і зямлі, і ў Езуса Хрыста, Сына Яго адзінага, Пана нашага, які быў зачаты ад Духа Святога, нарадзіўся з Дзевы Марыі, замучаны пры Понцкім Пілаце, укрыжаваны, памёр і быў пахаваны; зышоў да адхлані, на трэці дзень уваскрос з памерлых, узышоў на неба, сядзіць праваруч Бога Айца ўсемагутнага, адтуль прыйдзе судзіць жывых і памерлых.

Веру ў Духа Святога, святы Касцёл каталіцкі, еднасць святых, адпушчэнне грахоў, уваскрашэнне цела, жыццё вечнае. Амэн.

*На **вялікіх** пацерках:*

Ойча Спрадвечны, ахвярую Табе Цела і Кроў, Душу і Боскасць наймілейшага Сына Твайго і Пана нашага, Езуса Хрыста,

- каб перапрасіць за грахі нашыя і ўсяго свету *(1 раз)*.

*На **малых** пацерках:*

Дзеля Яго балеснай мукі

- будзь міласэрны да нас і да ўсяго свету *(10 разоў)*.

*На заканчэнне:*

Святы Божа, Святы Моцны, Святы Несмяротны, –
- змілуйся над намі і над усім светам! *(3 разы)*

О Кроў і Вада, якая выплыла з Найсвяцейшага Сэрца Езуса як крыніца Міласэрнасці для нас, давяраем Табе *(3 разы)*

Езу, давяраю Табе.

**Малітва аб беатыфікацыі кс. Кафарэля.**

Божа, наш Ойча, ты ўклаў у глыбіню сэрца Твайго сына Анры Кафарэля імкненне да любові, што безупынна вабіла яго да Твайго Сына і натхняла гаварыць і сведчыць пра Яго.

Будучы прарокам нашых дзён, ён паказаў годнасць і прыгажосць паклікання кожнага чалавека, паводле слоў, з якімі Езус звяртаецца да ўсіх: "прыходзьце і ідзіце за Мною".

Ён натхняў сужэнствы да велічы сакрамэнту шлюбу, які паказвае таямніцу адзінства і плённай любові паміж Хрыстом і Касцёлам.

Ён паказаў, што і святары, і сужэнствы заклікаюцца да жыцця ў святле любові.

Ён падтрымліваў удоў, бо любоў мацнейшая за смерць.

Пад уздзеяннем Духа Святога ён многіх прывёў на шлях малітвы.

Ахоплены палаючым агнём, ён прытулкам быў Тваім, Госпадзе.

Божа, наш Ойча, праз заступніцтва Багародзіцы мы Цябе молім паскорыць дзень, у які Касцёл абвесціць святым яго жыццё, каб усе набывалі радасць ісці за Тваім сынам згодна са сваім уласным паклікannем у Касцёле.

Божа, наш Ойча, мы звяртаемся да Цябе праз заступніцтва айца Кафарэля, каб ён выпрасіў нам ласку... (сказаць, аб якой ласцы мы просім)



*Магніфікат*

Велічае душа мая Пана, *
і ўзрадаваўся дух мой у Богу, маім Збаўцы.

Бо ўзглянуў Бог на пакору сваёй слугі,*
і цяпер благаслаўляць мяне будуць усе пакаленні.

Бо вялікае ўчыніў мне Усемагутны,*
а імя Яго святое.

І міласэрнасць Яго з пакалення ў пакаленне*
над тымі, хто Яго баіцца.

Паказаў моц сваёй правіцы,*
рассеяў тых, хто пыхлівыя сэрцам.

Скінуў магутных з трону*
і ўзвысіў пакорных.

Даброт галодных насыціў, *
а багатых ні з чым адправіў.

Прыняў свайго слугу Ізраэля, *
памятаючы пра сваю міласэрнасць,

як абяцаў бацькам нашым,*
Абрагаму і яго патомству навекі.

Хвала Айцу і Сыну,*
і Духу Святому.

Як была спрадвеку, цяпер і заўсёды,*
і на векі вечныя. Амэн.